

# ТРЫМАЦЬ ПОРАХ СУХІМ









Падчас сумеснага стратэгічнага вучэння Узброеных Сіл Беларусі і Расіі «Захад-2021», якое гэтымі днямі праходзіць на тэрыторыі дзвюх краін, ваеннаслужачыя асвойваюць новыя метады вядзення абарончага бою ў сучасных умовах, адпрацоўваюць варыянты сумесных дзеянняў, вучацца зладжана рэагаваць на ваенную агрэсію з боку ўмоўнага праціўніка.

На чатырох беларускіх і дзевяці расійскіх палігонах разгарнуліся набліжаныя да рэальных баявыя дзеянні. У вучэнні задзейнічаны прадстаўнікі ўсіх родаў войск. Упершыню ў падобных манеўрах удзельнічаюць казахстанцы — такім чынам дэманструецца адзінства гатоўнасці да сумеснага выканання задач усімі краінамі АДКБ.

Для кожнага вайскоўца — ад радавога да генерала — за гонар прыняць удзел у такім маштабным вучэнні. З пачуццём высокай адказнасці яны выконваюць усе пастаўленыя задачы: ад іх баявога майстэрства і ўзаемадзеяння адзін з адным залежыць многае. У тым ліку мір і бяспека, якія ў нашай краіне пад кантролем сапраўдных прафесіяналаў.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Аліны МАЗАВЕЦ.**

